## АБ ЛЮДЗЯХ, ІХ СПРАВЕ, ПРЫЗВАННІ

# ВЯСКОВЫ БІБЛІЯТЭКАР

***"Бібліятэкар — гэта не прафесія, а стан душы",— сказаў хтосьці з мудрых. А М. Рэрых пра бібліятэку выказаўся так: "Бібліятэка — гэта месца працы, і "храм душы", і навукова-даследчы цэнтр, і лабараторыя, і музей, і вышэйшая школа, і месца высокіх радасцей, свята роздуму".***

І хаця вясковая Шчомысліцкая бібліятэка знаходзіцца ў невялікім пакойчыку сельскага Дома культуры, яна дала пуцёўку ў свет навукі вучням, студэнтам, навукоўцам. Загадвае бібліятэкай з 1978 года Раіса Мікалаеўна Лабашова, выпускніца бібліятэчнага факультэта Мінскага інстытута культуры.

Раіса Мікалаеўна да апантанасці любіць сваю работу, сваіх чытачоў, асабліва маленькіх, якіх яна вучыла шанаваць кнігу, пазнаваць праз яе свет, знаходзіць у ім сваё месца.

Вельмі частыя тут госці — школьнікі. І знаходзяць у "краіне кнігі" юныя чытачы шмат цікавага: з 12 тысяч экземпляраў бібліятэчнага фонду — 5 тысяч дзіцячай літаратуры. Шмат розных часопісаў: "Вясёлка", "Вожык", "Пазнайка", "У свеце раслін", "У свеце жывёл" і іншыя.

— Да нас часта паступае новая дзіцячая літаратура. Дзеці ведаюць гэта і часта забягаюць,— расказвае Раіса Мікалаеўна. — Адначасова яны бяруць кнігі, часопісы для сваіх бацькоў. Да нас прыходзіць больш 10 газет: "Звязда", Мінская праўда", "Савецкая Беларусь". Часта чытачы прыходзяць пазнаёміцца з імі: чым жыве свет.

У час размовы адзін за адным прыходзяць вучні, просяць запісаць выбраную кнігу. Пакуль Раіса Мікалаеўна абслугоўвае чытачоў, я разглядаю афармленыя ёю стэнды. Іх тут нямала, размешчаны яны ўздоўж сцен. Адзін з іх прысвечаны вялікай падзеі — 60-годдзю Перамогі. Не забыта Радзіма. Яна на стэндзе "Зямля бацькоў нашых". Аб усім гэтым можна даведацца з падборак кніг. Заўважаю ўпершыню ў жыцці такую назву стэнда: "Сямейная акадэмія". На паліцах раздзелы: "Бацькам аб дзецях", "У садзе, у агародзе", "Прыемнага апетыту".



Назіраю, як чытачы цікавяцца кнігамі аб прыродзе на стэндзе "Прырода просіць паратунку". Яго раздзелы "Чырвоная Кніга" трывогі", "Зялёныя лёгкія планеты", "Асцярожна: іх мала".

Сталы накрыты белымі абрусамі з карункамі і вышыўкай. На адным з іх і на сцяне — экспанаты выставы "Шчомысліцкія ўмельцы". Тут і вязанне Клаўдзіі Канстанцінаўны Шчур, плецены кошык Івана Іванавіча Малашкі, розныя падзелкі з саломы, вышываныя вырабы.

**— А якія новыя формы работы?** — цікавімся ў гаспадыні "храма душы".

— Чытачоў-ветэранаў ВАВ, пенсіянераў, абслугоўваем на даму, носім ім часопісы, газеты, кнігі. Да прыкладу, Мікалаю Архіпавічу Галенчыку, Леаніду Пятровічу Бараноўскаму больш падабаецца перыёдыка.

**— А хто вам у гэтым дапамагае?**

— У асноўным, вучні — актывісты бібліятэчнай справы: Іна Азаркевіч, Оля Голуб, Саша Крэсік, Наташа Голуб, Таня Багданчык і іншыя. Яны ўдзельнічаюць у розных мерапрыемствах, дапамагаюць у афармленні, малююць, рыхтуюць матэрыял для выстаў.

Пры бібліятэцы дзейнічае клуб "Верасок". Асноўны яго напрамак — экалагічны. Праводзяцца экалагічныя ўрокі "Прырода просіць абароны", інфармацыйныя часы "Вада — гэта жыццё", урокі дабрыні "Пакарміце птушак зімой".

На конкурс малюнкаў "Люблю свой край" было прадстаўлена шмат работ, дзе чытачы малявалі свой дом, вуліцу, мясцовыя куткі прыроды.

Праводзіцца работа ў бібліятэцы па фарміраванню маральных якасцей, падбіраюцца і абмяркоўваюцца літаратурныя творы на зададзеныя тэмы: на міласэрнасць, спачуванне, бескарыслівасць і г.д. Надаецца ўвага выхаванню падлеткаў, з імі арганізоўваюцца гутаркі па веданню законаў, наладжваюцца сустрэчы з інспектарам па справах непаўналетніх.

Накірункаў работы бібліятэкі шмат, а галоўным з іх з'яўляецца адраджэнне нацыянальнай культурнай спадчыны, актывізацыя сацыяльнай дзейнасці. За сваю працу Раіса Мікалаеўна неаднаразова атрымлівала граматы ад кіраўніцтва раённай цэнтральнай бібліятэкі.

**Тамара ШАЎЧЭНКА.**

*НА ЗДЫМКУ: на выставе ёсць і вучнёўскія вырабы.*

**Наша жыццё. – 2005. – 14 мая.**